**Г. У. Кузьменка** (Беларусь, Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя І. П. Шамякіна)

# З'ЯВА ДЭНАМІНАЦЫІ Ў АЙКАНІМІЧНАЙ СІСТЭМЕ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ
## (на матэрыяле складаных айконімаў)

Айканімічная сістэма любой мовы паступова абнаўляецца. Паселішчы і іх назвы развіваюцца дыялектычна: адны знікаюць, другія ствараюцца. З развіццём мовы, культуры і зменамі жыццёвых рэалій замест некаторых традыцыйных назваў з'яўляюцца новыя, часам складаныя айконімы (айконімы-кампазіты), якія ўтрымліваюць у структуры тыповыя для пэўнага часу лексічныя асновы. Такую з'яву ў айканіміі прынята называць *дэнамінацыяй* (ад лац. *denominatio* – перайменаванне). Яна адбываецца пераважна пад уплывам экстралінгвістычных фактараў.

Намі выяўлена 109 складаных айконімаў, на станаўленне і знікненне якіх у сучаснай беларускай мове паўплываў працэс перайменаванняў. У выніку такога працэсу стварылася больш за 50 новых айконімаў-кампазітаў, што складае 6 % ад іх агульнай колькасці (900 адзінак): *Белаазёрск* (тут і далей былыя назвы – *Ніўкі**, *Бярозаўскі**), *Навасёлкі* (*Царкавішча**), *Наваспаск* (*Ферма**) і інш.

У артыкуле зроблена спроба разгледзець структурна-семантычныя тыпы новых айконімаў-кампазітаў, якія існуюць у айканімічнай сістэме сучаснай беларускай мовы ў выніку дэнамінацыі.

У працэсе дэнамінацыі, які найбольш выявіўся ў XX стагоддзі, для ідэнтыфікацыі паселішча нярэдка ствараліся складаныя айконімы, якія выяўлялі празрыстае значэнне: *Дабраполле* (*Жабіна**), *Новаіванаўка* (*Галодная**), *Слаўгарад* (*Прапойск**) і інш., некаторыя ўтрымлівалі пэўную сацыяльна-ідэалагічную семантыку: *Камсамольск* (*Дзюрдзеў**), *Першамайск* (*Гасподы**), *Саўгасная* (*Царкоўе**) і інш. Гэты працэс быў тыповым для таго перыяду, таму што сістэма новых

МГПУ им. И.П.Шамякина

айконімаў з’яўлялася важным сродкам адлюстравання змен грамадскага ладу краіны.

У сістэме беларускай айканіміі на сучасным этапе налічваецца 129 *Навасёлкаў,* 40 *Першамайскіх,* 35 *Навасадаў.* Такія назвы-паўторы не выконваюць у пэўнай меры дыферэнцыйную функцыю. Новыя айконімы-кампазіты, па задуме іх стваральнікаў, павінны былі не толькі ствараць эфект навізны, а і надаваць эстэтычнасць назве.

Асобныя перайменаванні адбываліся стыхійна: страчваліся разам і рэліктавыя онімы – *Ганнаспаская** (сучасная назва – *Заазёрная*), *Іван-Бор** (*Красны Акцябр*), *Рудабелка** (*Акцябрск*) і інш. У радзе выпадкаў разам з першапачатковым (папярэднім) айконімам рэтраспектавалася інфармацыя, што была звязана з аб’ектам і замацавалася ў яго назве: *Краснаязвёздны* (*Сталіна**), *Новакузнечная* (*Шыя**), *Першамайск* (*Папоўка**) і інш. У выніку ў беларускую сістэму тапонімаў былі ўведзены “рафініраваныя штампы”, запазычаныя пераважна з рускай мовы [2, с. 185]. А паколькі айконім з’яўляецца заўсёды “прадуктам сваёй эпохі”, то замена яго стварае ілюзію, што перад намі новае паселішча, а не вёска ці горад са шматвяковай гісторыяй [1, с. 144].

Замена ранейшай назвы паселішча на новую дыктавалася ў асобных выпадках эстэтычнымі мэтамі і меркаваннямі – *Чырвонабярэжжа* (*Злодзін**), *Навасёлкі* (*Галякі**), *Першамайка* (*Злыднікі**) і інш. У выніку адбылося пашырэнне семантыкі такіх прэпанентных асноў-атрыбутываў, як *красны* – ‘цудоўны, прыгожы’, ‘чырвоны, пурпуровы’, ‘новы, сацыялістычны, народжаны рэвалюцыяй’, *новы* – ‘шчаслівы, новы лад жыцця’, ‘які мае адносіны да савецкай эпохі’.

Новыя айконімы-кампазіты, якія існуюць у айканімічнай сістэме сучаснай беларускай мовы ў выніку дэнамінацыі, згрупаваны намі ў чатыры структурна-семантычныя тыпы:

- складаныя айконімы-меткі: *Наваселле* (*Падувінскі**), *Светлагорск* (*Шацілкі**), *Слаўгарад* (*Прапойск**) і інш.;
- складаныя айконімы-апісанні: *Краснасельскі* (*Краснае Сяло**), *Першамайскі* (*Пасёлак імя Бухарына**), *Сінягорская* (*Трубаносы**) і інш.;
- складаныяайконімы-рэгістратары:*Белаазёрск*(*Ніўкі**, *Бярозаўскі**), *Салігорск* (*Нова-Старобінск**), *Сеназавод* (*Сянная**) і інш.;
- складаныя айконімы-мемарыятывы: *Роза-Люксембург* (*Алеская**).

Значны паводле колькаснай суаднесенасці структурна-семантычны тып утвараюць складаныя айконімы-меткі. Яны выдзяляюць канкрэтныя геаграфічныя аб’екты, аднак не змяшчаюць у семантычным плане адметнай, спецыфічнай для чалавека інфармацыі – *Наваселле* (*Падувінск**), *Навасёлава* (*Двор Павулле**, *Павулле**), *Навасёлы* (*Доўгі Памёт**) і інш. Пераважная частка айконімаў-кампазітаў вызначанага тыпу ўтворана паводле дэрывацыйнай мадэлі “атрыбутыў + субстантыў” шляхам асноваскладання пры дапамозе фармантаў -*аў*-, -*j*-,-*ск*-.

МГПУ им. И.П. Шамякина

Другі тып – складаныя айконімы-апісанні. Асновай для іх узнікнення з’явілася найбольш важная прымета аб’екта – *Ключагорская* (*Бедавіцы**), *Краснаазёрная* (*Галоднічы**), *Мілавідная* (*Быкі**) і інш. Значная частка айконімаў-кампазітаў такога тыпу ўтворана паводле мадэлі “атрыбутыў + субстантыў” шляхам асноваскладання пры дапамозе фармантаў *-н-*, *-ск-*.

Трэці тып – складаныя айконімы-рэгістратары. Асновы айконімаў-кампазітаў адзначанага тыпу ўтрымліваюць інфармацыю аб характары саміх паселішчаў або акаляючага іх асяроддзя – *Верхнядзвінск* (*Дрыса**), *Раман-Віна* (*Ніцка-Віна*)*, *Рудня-Каменева* (*Папоўская Рудня**) і інш. Частка іх утворана паводле мадэлі “атрыбутыў + субстантыў” шляхам асноваскладання пры дапамозе фармантаў *-еў-*, *-j-*, *-ск-*, спарадычна – паводле мадэлей “субстантыў + субстантыў”, “субстантыў + атрыбутыў”, шляхам словаскладання без дапамогі фармантаў.

Чацвёрты тып – складаныя айконімы-мемарыятывы. Асновы айконімаў-кампазітаў названага тыпу ўтрымліваюць у структуры імёны, прозвішчы вайскоўцаў, грамадскіх, палітычных дзеячаў: *Асман-Касаева* (*Сярмяжанка**), *Кругавец-Калініна* (*Кругавец**), *Роза-Люксембург* (*Алеская**). Такія айконімы-кампазіты ўтвораны паводле мадэлей “субстантыў + субстантыў”, “субстантыў + атрыбутыў” шляхам словаскладання пры дапамозе фармантаў *-еў-*,*-ец-*, *-ін-*.

Наглядную інфармацыю аб лакалізацыі новых айконімаў-кампазітаў, аб храналогіі перайменаванняў айконімаў у савецкі перыяд праілюструем табліцамі 1, 2:

Табліца 1. ***Лакалізацыя новых айконімаў-кампазітаў*** **(паводле структурна-семантычных тыпаў, колькасна-рэгіянальнай суаднесенасці).**

| Вобласць | Тыпы | | | | Усяго (у адзінках) |
|---|---|---|---|---|---|
| | складаныя айконімы-меткі | складаныя айконімы-апісанні | складаныя айконімы-рэгістратары | складаныя айконімы-мемарыятывы | |
| Гомельская | 11 | 3 | 3 | 2 | 19 |
| Віцебская | 5 | 3 | 3 | - | 11 |
| Магілёўская | 3 | 2 | 1 | 1 | 7 |
| Мінская | 5 | 1 | - | - | 6 |
| Гродзенская | 1 | 5 | - | - | 6 |
| Брэсцкая | 2 | 1 | - | - | 3 |
| Усяго (у адзінках) | 27 | 15 | 7 | 3 | 52 |

Табліца 1 паказвае, што злоўжыванне ідэнтычнымі айконімамі-кампазітамі адлюстравалася ва ўкараненні іх на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Найбольш – на Гомельшчыне, спарадычна – на Брэстчыне і Гродзеншчыне, што абумоўлена розным культурна-гістарычным развіццём рэгіёнаў.

Табліца 2. ***Храналогія дэнамінацыі айконімаў у савецкі перыяд***

МГПУ им. И.П.Шамякина

**(паводле тэмпаральна-рэгіянальнай суаднесенасці)**

| Новыя (існуючыя) айконімы-кампазіты | Папярэднія айконімы | Год перай-менавання | Раён | Вобласць |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| *Асман-Касаева* | Сярмяжанка | 1964 | Бялыніцкі | Магілёўская |
| *Белаазёрск* | Ніўкі, Бярозаўскі | 1958,1960, 1970 | Бярозаўскі | Брэсцкая |
| *Верхнядзвінск* | Дрыса | 1962 | Верхнядзвінскі | Віцебская |
| *Дабраполле* | Жабіна | 1964 | Сенненскі | Віцебская |
| *Камсамольск* | Дзюрдзеў | 1935 | Рэчыцкі | Гомельская |
| *Камсамольская* | Пукава | 1964 | Капыльскі | Мінская |
| *Камсамольскі* | Байдак | 1950 | Быхаўскі | Магілёўская |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| *Ключагорская* | Бедавіцы | 1964 | Гарадоцкі | Віцебская |
| *Краснаазёрная* | Галоднічы | 1964 | Смаргонскі | Гродзенская |
| *Краснazвёздны* | Сталіна | 1962 | Краснапольскі | Магілёўскі |
| *Краснапольцы* | Амерыка | 1964 | Аршанскі | Віцебская |
| *Краснасельскі* | Краснае Сяло | 1958 | Ваўкавыскі | Гродзенская |
| *Кругавец-Калініна* | Кругавец | 1920 | Добрушскі | Гомельскі |
| *Кураполле* | Дзевятнікі | 1918 | Пастаўскі | Віцебская |
| *Мілавідная* | Быкі | 1969 | Воранаўскі | Гродзенская |
| *Навапольцы* | Гавезна-1 | 1964 | Стаўбцоўскі | Мінская |
| *Наваселле* | Падувінск | 1935 | Рагачоўскі | Гомельская |
| *Навасёлава* | Двор Павулле, Павулле | 1964 | Чашніцкі | Віцебская |
| *Навасёлкі* | Царкавішча | 1938 | Віцебскі | Віцебская |
| *Навасёлкі* | Галякі | 1964 | Калінкавіцкі | Гомельская |
| *Навасёлы* | Доўгі Памёт | 1964 | Барысаўскі | Мінская |
| *Наваспаск* | Ферма | 1964 | Смаргонскі | Гродзенская |
| *Новазаронава* | Новая Дзярэўня | 1966 | Шумілінскі | Віцебская |
| *Новаіванаўка* | Галодная | 1924 | Веткаўскі | Гомельская |
| *Новакузнечная* | Шыя | 1938 | Лоеўскі | Гомельская |
| *Першамай* | Гараваха | 1964 | Петрыкаўскі | Гомельская |
| *Першамай* | Плевакі | 1964 | Дзяржынскі | Мінская |
| *Першамайка* | Злыднікі | 1964 | Гарадоцкі | Віцебская |
| *Першамайск* | Папоўка | 1938 | Лоеўскі | Гомельская |
| *Першамайск* | Святое | 1934 | Рэчыцкі | Гомельская |
| *Першамайск* | Кабылёва | 1939 | Рэчыцкі | Гомельская |
| *Першамайск* | Гасподы | 1939 | Горацкі | Магілёўская |
| *Першамайск* | Свінная | 1964 | Докшыцкі | Віцебская |
| *Першамайск* | Прышыхвасты, Прышыхасты | 1940 | Драгічынскі | Брэсцкая |
| *Першамайск* | Засунне | 1931 | Лельчыцкі | Гомельская |
| *Першамайская* | Сабакінцы | 1954 | Шчучынскі | Гродзенская |
| *Першамайская* | Блудзень | 1964 | Бярозаўскі | Брэсцкая |
| *Першамайская* | Бузава | 1938 | Верхнядзвінскі | Віцебская |
| *Першамайскі* | Пасёлак імя Бухарына | 1937 | Веткаўскі | Гомельская |
| *Першамайскі* | Кашчыца | 1948 | Карэліцкі | Гродзенская |
| *Раман-Віна* | Ніцка-Віна | 1940 | Чавускі | Магілёўская |
| *Роза-Люксембург* | Алеская | 1919 | Ельскі | Гомельская |
| *Рудня-Каменева* | Папоўская Рудня | 1924 | Лоеўскі | Гомельская |
| *Салігорск* | Нова-Старобінск | 1958 | Салігорскі | Мінская |
| *Саўгасная* | Царкоўе | 1964 | Буда-Кашалёўскі | Гомельская |
| *Светлагорск* | Шацілкі | 1961 | Светлагорскі | Гомельская |
| *Светлагорск-на-Бярэзіне* | Шацілкі | 1966 | Светлагорскі | Гомельская |
| *Сеназавод* | Сянная | 1954 | Рэчыцкі | Гомельская |

МГПУ им. И.П.Шамякина

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| *Сінягорская* | Трубаносы | 1964 | Сенненскі | Віцебская |
| *Слаўгарад* | Прапойск, Прупой, Прупошэск, Прапошаск | 1945 | Слаўгарадскі | Магілёўская |
| *Чырвонабярэжжа* | Злодзін | 1964 | Лельчыцкі | Гомельская |

Табліца 2 паказвае, што перайменаванні адбываліся найбольш у 30-я і 60-я гады XX стагоддзя.

Такім чынам, разгледжаны лінгвістычны матэрыял дае падставы сцвярджаць, што:

1. Дэнамінацыя ў айканімічнай сістэме сучаснай беларускай мовы, у прыватнасці ў сістэме складаных айконімаў XX стагоддзя, дастаткова пашыраная з'ява.

2. Новыя айконімы-кампазіты ствараліся пераважна каб выконваць экстралінгвістычныя функцыі: культурныя, сацыяльна-ідэалагічныя.

3. Сярод іх значны структурна-семантычны тып паводле колькаснай суаднесенасці ўтвараюць складаныя айконімы-меткі, найменшы – складаныя айконімы-мемарыятывы.

4. Новыя айконімы-кампазіты ўтвараліся пераважна па вядомых дэрывацыйных мадэлях "атрыбутыў + субстантыў", "субстантыў + субстантыў", "субстантыў + атрыбутыў" шляхам асноваскладання і словаскладання пры дапамозе тыповага ў савецкі перыяд фарманта -*ск*-.

**Літаратура**

1. Суперанская, А. В. Имя и эпоха (к постановке проблемы) / А. В. Суперанская // Историческая ономастика: сб. науч. ст. / редкол.: А. В. Суперанская (отв. ред.) [и др.]. – М.: Наука, 1977. – С. 144–152.

2. Шур, В. В. Беларускія ўласныя імёны: Беларуская антрапаніміка і тапаніміка / В. В. Шур. – Мінск: Маст. літ., 1998. – 239 с.

МГПУ им. И.П. Шамякина